## Літаратура


1. Гарэцкі, М. Збор твораў. У 4-х т. Т.1. Апавяданні / Максім Гарэцкі. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1984. – 446 с.



***Валянціна Маршэўская***

*(Гродна)*


# ПАБОЧНЫЯ КАНСТРУКЦЫІ ДЗЕЯСЛОЎНАГА ТЫПУ Ў МОВЕ ТВОРАЎ М. ГАРЭЦКАГА

Пабочнымі канструкцыямі называюцца словы, словазлучэнні і сказы, якія выражаюць розныя адценні адносінаў моўцы да зместу выказвання, да рэчаіснасці: выражаюць верагоднасць, несумненнасць, поўную адпаведнасць зместу паведамлення фактам рэчаіснасці (*зразумела, вядома, разумеецца і* інш.); служаць выражэннем неверагоднасці, папярэдняга меркавання, няпэўнасці (*відаць, здаецца, трэба думаць і* пад.); паказваюць на крыніцу паведамлення (*як кажуць, як вядома, маўляў і* г.д.); характарызуюць спосаб і форму паведамлення (часта з рознымі суб'ектыўнымі адценнямі) (*карацей кажучы, смешна сказаць, мякка кажучы і* інш.); вызначаюць лагічную суадноснасць паміж асобнымі часткамі паведамлення (*значыць, як адзначалася і* інш.); надаюць эмацыянальную афарбоўку паведамленню (*як на бяду, на маё здзіўленне і* г.д.); афармляюць зварот да слухача з мэтай прыцягнуць увагу да паведамлення, навязаць пэўныя адносіны да фактаў (*будзьце добры, прабач, калі ласка, ці бачыш, памятаеш, згадзіся, падумаць толькі і* інш.); даюць ацэнку значнасці пэўнага факта (*лёгка сказаць,жарты сказаць і* пад.) і інш. У сказе пабочныя канструкцыі звычайна выдзяляюцца коскамі (у адрозненне ад устаўных канструкцый, якія выдзяляюцца дужкамі) (гл. больш падрабязна [3]).

На думку лінгвістаў, пабочныя канструкцыі з'яўляюцца адным з відаў парантэзы (грэч. *parenthesis*) – "унясенне, устаўка якіх-небудзь элементаў, што суадносяцца са зместам асноўнага саставу сказа ці яго канструктыўных частак, але выходзяць за межы звычайных сінтаксічных сувязей паміж кампанентамі гэтага саставу. Парантэза ажыццяўляецца галоўным чынам з дапамогай інтанацыйных сродкаў мовы і абумоўліваецца або неабходнасцю аўтарскай характарыстыкі ці ацэнкі зместу выказвання" (гэтаму служаць пабочныя канструкцыі), "або неабходнасцю паведаміць нейкія дадатковыя заўвагі адносна зместу выказвання ў цэлым ці асобных яго частак" (гэтаму служаць устаўныя канструкцыі)[1, с. 192]. М. Гарэцкі шырока карыстаўся такім відам парантэзы, ствараючы свае апавяданні ("Роднае карэнне", "Літоўскі хутарок", "Генерал", "Стары прафесар" і інш.), аповесці "У чым яго крыўда?", "Меланхолія", "Ціхая плынь", дакументальна-мастацкія запіскі "На імперыялістычнай вайне" [2].

Пабочныя канструкцыі, выяўленыя ў мове названых твораў М. Гарэцкага, паводле аб'ёму і структуры бываюць аднаслоўныя (*кажу, здаецца*) ці ў спалучэнні з адмоўем *не* або часціцай *ці* (*не паверыш, ці ведаеце*),

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ